**Дзяржаўная ўстанова адукацыі**
**"Гоцкі вучэбна-педагагічны комплекс дзіцячы сад – сярэдняя школа**
**Салігорскага раёна**





# Занятак-практыкум для дашкольнай рознаўзроставай групы "Мы гатуем вінегрэт"


**Падрыхтавалі:**

**Ермаковіч Г.П., Курак Т.І.,**

**выхавальнікі рознаўзроставай**

**дашкольнай групы**


**ГОЦК 2019**

**Занятак-практыкум для дашкольнай рознаўроставай групы**
**“Мы гатуем вінегрэт”**

**Мэта:** пазнаёміць выхаванцаў з працэсам прыгатавання вінегрэта.

**Задачы:**

*замацаваць веды аб уласцівасцях агародніны,

* фарміраваць уменне адбіраць патрэбныя прадукты для прыгатавання салаты;

*развіваць у выхаванцаў жаданне і цікавасць да прыгатавання салаты;

*фарміраваць працоўныя навыкі і жаданне дапамагаць дарослым.

**Матэрыял:** “пісьмо”, прадметныя малюнкі – адгадкі агародніны, натуральныя віды садавіны і агародніны, агародніна (сырая і вараная), набор посуду для прыгатавання салаты, фартушкі, каўпакі.

**Ход занятка**

**Выхавальнік:** Дзеці! Кожную раніцу мы вітаем адзін аднаго. Давайце і сёння павітаемся ўсмешкай, ручкамі абдымемся і скажам “Добры дзень” *(дзеці вітаюцца).*

– Сёння на мой погляд, незвычайны дзень. Да нас прыйшлі госці, але хваляваціа не будзем, наадварот, пакажам свае ўменні і навыкі. Добра? Адкажыце калі ласка. Якая зараз пара года? (Восень)

– Так, восень. Малайцы!

– А чаму кажуць, восень-залатая? (Жоўтае лісце, як золата і вялікі ўраджай агародніны). – А якую агародніну сабралі людзі на агародзе? (Бульбу, капусту, моркву, цыбулю, буракі, агуркі, памідоры). А як адным словам гэта можна назваць? (Агароднiна).

–Так. Згодна – агародніна.

– Якую ежу можна прыгатаваць з агародніны? (Салату, боршч, начынку для пірагоў, вінігрэт, капусту кіслую, і г.д.).

– А давайце самі прыгатуем вінегрэт? –Але ж дзе нам узяць агародніну для вінегрэта? У нас толькі ёсць агародніна на малюнках. (Адказы выхаванцаў: узяць на агародзе, купіць у магазіне).

– Ведаеце, калі я раніцай ішла на работу, то ў паштовай скрынцы ляжала пісьмо (вось яно – паказвае ). А прыслала нам яго бабуля Гануля. Яна піша, што ў яе на агародзе вырасла шмат агародніны. Давайце патэлефануем бабулі і папросім яе прывезці нам агародніну. (*Выхавальнік тэлефануе бабулі Ганулі і размаўляе з ёй).*

– Дамовілася. Бабуля хутка прывязе нам агародніну. А пакуль бабуля едзе да нас, давайце ўспомнім, якая агародніна патрэбна для вінегрэта? Я вам загадаю загадкі, а вы паспрабуйце адгадаць.

*Выхавальнік загадвае загадкі, малюнкі-адгадкі вывешвае на дошцы.*

1. От бабуля важна села
   І глядзіць навокал смела.
   У зямлю схавала лапаць,
   Як зацэпіш – будзеш плакаць.
   Гэта злосная бабуля,
   Называецца …(цыбуля)
2. Сакавіты, круглаваты
   Здаравяка гэты.
   Нам патрэбны на салаты,
   Ды на вінегрэты …(бурачок)
3. Круглы ён, але не мячык,
   Ёсць нага, але не скача,
   Шмат лістоў, але не сшытак.
   Апрануў паўсотні світак (качан капусты).
4. Сама аранжавая, жыве ў зямлі.
   А зялёная каса на вуліцы?
   Што гэта?...(Морква)
5. На градцы доўгі і зялёны,
   А ў бочцы – жоўты і салёны (агурок).
6. А з апошняй загадкі,
   Робяць смачныя аладкі.
   Яе смажаць і пякуць,
   Кашу смачную таўкуць (бульба).

*Раздаецца стук у дзверы.*

**Бабуля:** Добры дзень усяму добраму люду! Усе госці сышліся – сабраліся? Як любыя даехалі – дабраліся? Добры дзень, мае дзетачкі-кветачкі!

**Дзеці:** Добры дзень!

**Выхавальнік**: Вось і бабуля Ганула прыехала і прывезла нам цэлы кошык агародніны. *(Агародніна ляжыць у мяшэчку).*

**Бабуля:** Ой, дзеткі, я да вас спяшалася і ўсё наблытала, сабрала ў мяшок і агародніну і садавіну. Дапамажыце мне разабраць. Кожны з вас апусціць руку ў мяшэчак, угадае што ён узяў. Калі гэта агародніна, палажыць у кош для агародніны, а калі садавіна – то у кош для садавіны.

**Праводзіцца гульня: "Чароўны мяшэчак".**

**Выхавальнік:** Ну вось, усю агародніну разабралі правільна. А з якой агародніны можна прыгатаваць вінегрэт? *(Дзеці называюць капусту, моркву, агурок, цыбулю, бурак).*

–Але ж для вінегрэта патрэбная вараная агародніна.

– Што ж нам рабіць? Дзе ж мы возьмем вараную агародніну? *(дзеці адказваюць, дзе можна ўзяць вараную агародніну: на кухні, папрасіць кухара, каб зварыў).*

**Бабуля:** Я вам дапамагу. Я ведаю чароўныя словы. Закрывайце вочкі, ні падглядвайце. *(Бабуля накрывае кошык хустачкай і кажа чароўныя словы. Кош мянецца на другі, дзе вараная агародніна нарэзана палоскамі).*

**Фізкультхвілінка.** Давайце пагуляем разам з бабуляй і пакажам, якая па велічыні агародніна вырасла на градцы.

Ладкі, ладкі, ладкі, мы палолі градкі (плясканне ў далонькі).

Ад стараннай працы выраслі на градцы вось такія агуркі

*(развесці рукі ў бакі)*

Вось такія буракі *(развесці рукі ў бакі),*

А капусты качаны *(прысесці)* вось такой велічыні (*падняцца, развесці рукі ў бакі)*

**Бабуля:** Вось і вараная агародніна.

**Выхавальнік:** А зараз я вам прапаную прыгатаваць вінегрэт з варанай агародніны.

**Бабуля:** Сумаваць не прыйдзецца, усім праца знойдзецца. (Дзеці мыюць рукі, надзяваюць фартушкі, сядаюць на свае месцы. Успамінаюць правілы тэхнікі бяспекі. Рэжуць раней прыгатаваную  і нарэзаную палоскамі агародніну. Складваюць усё ў талерку, запраўляюць маслам, соллю).

Вінегрэт мы рыхтавалі, па рэцэпту ўсё паклалі:

Агурок, бурак, капуста, палілі алеем тлуста.

Мы стараліся рабілі, спадзяёмся, вас здзівілі!

*Бабуля раскладвае вінегрэт па талеркам, запрашае выхаванцаў за стол пакаштаваць салату. Пытаецца,  ці смачны вінегрэт.*

**Выхавальнік:** Гасцей таксама трэба пачаставаць. Што трэба сказаць гасцям – Смачна есці! (*Выносіцца міска з гатовым вінегрэтам і аднаразавыя відэльцы).*

**Выхавальнік:** Дзеці, што мы гатавалі сення? Што вам асабліва спадабалася?

*Дзеці дапамагаюць бабулі і выхавальніку прыбраць са стала.*